# Нашы юбіляры

## ВОЛЬГА ВАСІЛЬЕЎНА КАЗЛОВА

Адзначыла свой 80-гадовы юбілей кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры І культуры, Заслужены работНІК вышэйшай школы Беларусі Вольга Васільеўна Казлова. За яе плячыма - шматгадовая пачэсная праца на ніве беларускай філалагічнай навукі і адукацыі, Яна мудры педагог, які мае багаты жыццёвы вопыт.

Вольга Васільеўна - дачка славутага кіраўніка партызанскага руху ў Беларусі, вядомага дзяржаўнага дзеяча, Героя Савецкага Саюза Васіля Іванавіча Казлова. Яна нарадзілася 25 мая 1925 г. на Гомельшчыне: бацька ў той час быў чыгуначнікам. Яе дзяцінства прайшло ў вясковым асяроддзі, у атмасферы новага часу, народжанага Кастрычнікам. Жыццёвы прыкпад і лёс бацькоў зрабілі вялікі ўплыў на станаўленне патрыятычнага светапогляду, актыўнай грамадзянскай пазіцыі дачкі. Вялікая Айчынная вайна застала сям'ю Казловых у Мінску. З першых дзён вайны В В. Казлова ўдзельнічала ў будаўніцтве акопаў[п] сховішчаў ад нямецкіх бамбёжак у Мінску. Пасля неаднаразовых эвакуацый з мясцін франтавых падзей яна разам з маці і сястрой выехала ў Башкірыю, дзе ў 1942 г. закончыла сярэднюю школу.

У 1943 г. Вольга Васільеўна паступіла на філалагічны факультэт БДУ, які аднавіў сваю работу на станцыі Сходня пад Масквой. У час вучобы, па заданні бацькі, у той час першага сакратара Мінскага падпольнага абкома КПБ, камандзіра Мінскага партызанскага злучэння В.І. Казлова, займалася наладжваннем сувязей раскіданых вайной сем'яў партызан І падпольшчыкаў для аказання ім дапамогі Цэнтральным штабам партызанскага руху Беларусі. Вельмі цікавым і ўпершыню абнародаваным у зборніку «Наша Перамога» (2004), прысвечаным 60-годдзю вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў, з'яўляецца наступны факт яе біяграфіі: яна ўнесла ў фонд абароны краіны свой студэнцкі «скарб» - стыпендыю і напісала ліст Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму войскамі СССР І.В. Сталіну: «Воодушевленная успехами Красной Армии на фронтах Отечественной войны и, желая быстрейшего разгрома немецких захватчиков, вношу на строительство звена боевых самолетов "Московский студент" все свои сбережения - 1000 рублей. Этим самым я помогу нашей Красной Армии и славным партизанам, в числе которых находится мой отец, нанести быстрейший и сокрушительный удар». І вось які адказ быў атрыманы ёю: «Благодарю Вас, Ольга Васильевна, за Вашу заботу о воздушных силах Красной Армии. Примите мой привет и благодарность Красной Армии. И. Сталин».

Пасля вызвалення Мінска Вольга Васільеўна разам з калектывам БДУ вярнулася ў родны горад, працягвала вучобу, працавала на яго аднаўленні. У 1948-1951 гг. яна вучылася ў аспірантуры пры кафедры беларускай літаратуры БДУ пад кіраўніцтвам прафесара М.Р. Ларчанкі. Пасля абароны ў 1953 г. кандыдацкай дысертацыі пачала выкпадаць на кафедры беларускай літаратуры, у 1951 г. атрымала пасаду дацэнта; з 1972 па 1985 г. была загадчыкам гэтай кафедры.

Спецыялізацыя Вольгі Васільеўны - гісторыя беларускай літаратуры. Апрача філалагічнага факультэта і факультэта журналістыкі, яна чытала лекцыі ў Варшаўскім, Сафійскім імя К. Охрыдскага, Іенскім імя Ф. Шылера універсітэтах. Распрацавала спецкурсы «Тыпалогія творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа», «Якуб Колас - класік беларускай літаратуры», «Мастацкае ўвасабленне гістарычных падзей Вялікай Айчыннай вайны ў беларускай прозе». Падрыхтавала спецсемінары «Народны пясняр Якуб Колас у кантэксце сусветнай літаратуры», «Гімн працы ў спадчыне беларускіх пісьменнікаў», «Патрыятычны пафас беларускай літаратуры аб Вялікай Айчыннай вайне». Адной з крыніц натхнення пры падрыхтоўцы лекцыйных курсаў і семінарскіх заняткаў была навуковая праца, прысвечаная даследаванню творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Лынькова, Я. Брыля. П. Броўкі, А. Кулакоўскага, М. Мятліцкага і інш. Навуковыя літаратуразнаўчыя матэрыялы ўвайшлі ў двухтомны падручнік для ВНУ «Гісторыя беларускай савецкай

літаратуры: 1917-1940» (1982, дапрац. выд. - 1999), «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: 1941-1980» (1983), у хрэстаматыю «Беларуская літаратура. Проза 20-х гадоў» (1996,1997).

Навуковыя матэрыялы змешчаны ў зборніках «Песні беларускай валадар» (1981), «Творчая спадчына Янкі Купалы І Якуба Коласа і развіццё славянскіх моў і літаратур» (1982), «Святло яго душы» (1979) і інш. Уякасці дапаможніка для універсітэтаў народнай культуры выдала працы «Міхась Лынькоў» (1959), «Партызанскі свет у беларускім вершы» (1984), «Беларуская паэтычная лененіяна» (1986) і інш. Артыкулы В.В. Казловай апублікаваны ў шматлікіх зборніках матэрыялаў міжнародных навуковых канферэнцый, у навуковых зборніках «Каласавіны», у кнігах «Імёнаў светлае аблічча» (2002), «Наша Перамога» (2004) і інш. Яна, як кажуць, свой чалавек у літаратурных музеях Янкі Купалы і Якуба Коласа, часта выступав на навуковых канферэнцыях, бярэ ўдзел у розных святочных мерапрыемствах, прысвечаных творчасці беларускіх пісьменнікаў.

Шматгадовая праца ў вышэйшай школе з 1948 г. па сённяшні дзень спрыяла яе кіраўніцтву дыпломнікамі і аспірантамі, распрацоўцы і выданню тыпавой праграмы па гісторыі беларускай літаратуры XX ст. для ВНУ (1979; 1986) і праграм для універсітэтаў народнай культуры, праграмы для навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы (1981), публікацыі метадычных дапаможнікаў «Курсавыя І дыпломныя работы па беларускай літаратуры» (1963), «З назіранняў над майстэрствам Якуба Коласа-празаіка» (1962). Яе артыкулы часта з'яўляліся на старонках часопісаў «Полымя», «Роднае слова», газеты «Літаратура І мастацтва», у зборніках навукова-метадычных канферэнцый.

Дванаццаць год (1972-1985) В.В. Казлова працавала вучоным сакратаром спецыялізаванага Вучонага савета па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Яна была членам Вучонага савета БДУ, Вучонага савета філалагічнага факультэта, савета Музея Янкі Купалы, членам рэдакцыйнай калегіі часопіса «Веснік БДУ» (серыя IV), старшынёй навукова-метадычнага савета рэспублікі па гісторыі беларускай літаратуры (1970-1980-я гг.), членам навукова-каардынацыйнага савета па гісторыі беларускай літаратуры пры АН БССР.

За самаадданую, плённую працу В.В. Казловай прысвоена ганаровае званне «Заслужены работнік вышэйшай школы», яна ўзнагароджана трыма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, медалямі.

Будучы загадчыкам кафедры (1972-1985), Вольга Васільеўна ўсталявала трывалую сувязь са школамі рэспублікі, арганізоўвала сумесныя выязныя пасяджэнні з педсаветамі школ, дапамагала ўласнымі архіўнымі і наглядными матэрыяламі адкрыццю і папаўненню экспазіцый Музея Вялікай Айчыннай вайны Рэспублікі Беларусь, музеяў Масквы, Мінска. Салігорска, Жлобіна, Барысава. Яна часта выступав ў тэлевізійных і радыёперадачах па праблемах літаратуразнаўства і надзённых пытаннях жыцця грамадства.

Калегі па кафедры, увесь калектыў філалагічнага факультэта і шматлікія вучні сардэчна віншуюць Вольгу Васільеўну з юбілеем і зычаць цудоўнага самаадчування, новых творчых набыткаў і далейшай плённай дзейнасці ў грамадзянска-патрыятычным і маральным выхаванні студэнцкай моладзі.

*Кафедра беларускай літаратуры і культуры*

## ТАТЬЯНА НИКОЛАЕВНА ВОЛЫНЕЦ

Отметила свой юбилей доктор филологических наук, профессор кафедры русского языка Татьяна Николаевна Волынец - талантливый педагог и ученый, автор многочисленных научных работ по функциональной грамматике и лингвистике текста, школьных и вузовских учебников по русскому и белорусскому языкам.

Татьяна Николаевна родилась 1 мая 1955 г. в Семёнове (Горьковская область). После окончания средней школы в Лиде (Гродненская область) в 1971 г. поступила на филологический факультет Гродненского государственного педагогического института имени Я. Купалы, в 1975 г. - в аспирантуру при Белорусском государственном университете. Защитила кандидатскую диссертацию на тему «Структура русской глагольной парадигмы» в 1978 г. В 1978-1979 гг. работала в Институте языкознания имени Я. Коласа, в БГУ с 1980 г. сначала преподаватель, затем доцент, с 2000 г. - профессор кафедры русского языка. Два года (1988-1990) преподавала русский язык в Институте работников транспорта Дрездена (Германия).

После окончания докторантуры при БГУ в 1998 г. защитила докторскую диссертацию «Семантика и грамматика русского причастия в языковой системе».

Сфера научных интересов Татьяны Николаевны широка - это функциональная грамматика, словообразование, лингвистические переводы, язык средств массовой коммуникации, проблемы языковой ситуации и функционирования русского языка в Беларуси.

Т.Н. Волынец - автор более 90 научных работ, среди которых монографии «Язык дружбы» (1987), «Грамматический феномен причастия» (1998), брошюры «Причастие в грамматической